являются: железо (17,4%), марганец (16%), медь (16%). Содержание СПАВ (вещества антропогенного происхождения), большинства тяжелых металлов, нефтепродуктов и стойких органических загрязнителей в воде р. Западный Буг фиксировалось в концентрациях, не превышающих установленные нормативы [2].




***Рисунок 2 – Динамика числа превышений ПДК и общее число гидрохимических определений в бассейне р. Западный Буг [2]***

Вода р. Западный Буг по всему течению в 2008 г. соответствовала категории «умеренно загрязненная».

Таким образом, по всем показателям загрязнения вод бассейна р. Западный Буг имеют тенденцию к уменьшению. Это вызвано рядом причин, и в первую очередь снижением производственных мощностей промышленности и сельского хозяйства. В то же время данная картина может резко измениться, так как имеющиеся очистные сооружения физически изношены и нуждаются в реконструкции и совершенствовании.

## СПИСОК ЦИТИРОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ


1. Блакітная кніга Беларусі : Энцыклапедыя / Беларус. энцыкл.; рэдкал. Н.А. Дзісько [і інш.]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1994. – 415 с.

2. Мониторинг поверхностных вод // Главный информационно-аналитический центр Национальной системы мониторинга окружающей среды Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – 2004–2009. – Режим доступа: http://www.ecoinfoby.net/texts. – Дата доступа: 12.11.2009.



УДК 316.77:338.9



***Шведоўская Д.У.***

***Навуковы кіраўнік: преподаватель Шавялінская Н.Л.***


## ЗНАЧЭННЕ КРЫЖА ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ Ў ДУХОЎНЫМ ЖЫЦЦІ І СВЯДОМАСЦІ ЛЮДЗЕЙ У БЕЛАРУСІ

Без імя Еўфрасінні Полацкай немагчыма ўявіць не толькі панараму духоўнага жыцця на ўсходнеславянскіх землях у XII стагоддзі, але і ўсю шматвяковую гісторыю Беларусі. Князёўна, ігумення, выдатная асветніца, пра якую "Жыціе" кажа, што яна – "небопарный орёл, попаривши от Запада и до Востока, яко луча солнечная, просветивши всю землю Полоцкую», святая Еўфрасіння пакінула па сабе вечную памяць у душы народа.

Ужо ў юнацтве Еўфрасіння перапісвала і перакладала з іншых моваў кнігі, сама пісала арыгінальныя творы. Заснаваўшы ў Полацку два манастыры, яна надала пашырэнню пісьмовага слова вялікі размах. Гісторыкі звязваюць з яе імем полацкае летапісанне і збіранне бібліятэкі Сафійскага сабора. Князёўна-ігуменння рупілася, каб вучні манастырскіх школ разам з граматаю навучаліся "чистоте душевней и бесстрастию телесному».

Вялікім быў уплыў ігуменні на палітыку Полацка. Падзвіжніца ўздымала голас супроць княскіх усобіц, папярэджвала, што братазабойчыя войны могуць прывесці Бацькаўшчыну да гібелі.

Еўфрасіння Полацкая стала адной з першых кананізаваных (прылічаных да святых) жанчын на ўсходнеславянскіх землях.

"Калі ўспамінаеш мінулае нашай Беларусі, адразу ўстаюць у памяці з імглы вякоў дзьве славутыя жанчыны – княгіня Рагнеда і князёўна Прадслава.На першы погляд, паміж імі няма нічога супольнага. Сапраўды, як нельга ўявіць гордую Рагнеду без мяча, таксама нельга ўявіць сціплую Прадславу без крыжа. У меч Рагнеды і крыж Прадславы былі магутнай фізічнай і духовай зброяй, якая злучала нашую радзіму ў адзін суцэльны маналіт. Іхнія патрыятычныя пачуцці знайшлі яскравае ўвасабленьне ў старым рыцарскім клічу: "Мячом і крыжом!" Таму і сёння кожнаму ваяўнічаму і разам з тым глыбока чалавечаму беларускаму сэрцу шмат што гаворыць – меч Рагнеды і крыж Прадславы".

Гэтыя натхнёныя словы перагукваюцца з гістарычнай паэтыкай Янкі Купалы, што ўдыхнуў у вобразы нашых першых хрысціянак, Рагнеды і Еўфрасінні, ідэю незалежнасці Беларусі. Як нікому, апрача Ўсявышняга, не належыць Хрыстова нявеста, якую чакае царства нябеснае, так і Бацькаўшчына павінна быць вольнай і незалежнай, бо толькі тады здзяйсняюцца спадзяванні яе народа на светлую прышласць. Невыпадкова, дарэчы, менавіта Крыж святой Еўфрасінні быў адлюстраваны на першай паштовай марцы суверэннае Беларусі.

Крыж меў вышыню каля 51 сантыметра; даўжыня верхняе папярэчкі – 14, ніжняе – 21, таўшчыня – 2,5 см. Зверху і знізу дрэва закрывалі залатыя пласткі (усяго 22), аздобленыя каштоўнымі камянямі, арнаментальнымі кампазіцыямі і дваццаццю эмалевымі абразкамі з выявамі святых

Аснова крыжа драўляная. У часы Еўфрасінні асабліва важныя культавыя рэчы выраблялiся з кіпарысавага дрэва, якое скарыстаў і полацкі майстар. Вопісы рэліквіі, зробленыя ў XIX стагоддзі, яе дрэва нязменна называюць кіпарысавым, а не дубовым, як у больш позніх дакументах.

Крыж Божы мае шэсць канцоў-промняў. Шасціканцовая форма крыжа сімвалізавала створаны Богам за шэсць дзён свет. Сучасныя багасловы лічаць, што "якраз у такой форме ўвасоблены самы дасканалы сімвал першабытнага Сусвету. Ён адначасова сімвалізуе як пашырэнне Божае сілы, так і працэс вяртання свету да свайго духоўнага цэнтру".

Трэба адзначыць, што такая форма крыжа ніколі не была на ўсходнеславянскіх землях пераважнай і найчасцей сустракалася на абшары, населеным продкамі сучасных беларусаў. Найбольш вядомыя выявы шасціканцовых крыжоў захаваліся да нашых дзён на славутых "Барысавых камнях".

Крыж выконваў ролю каўчэга для атрыманых з Канстанцінопаля і Ерусаліма ад візантыйскага імператара Мануіла Камніна і патрыярха Лукі Хрысаверга хрысціянскіх святыняў. У пяці квадратных падпісаных гнёздах полацкага крыжа знаходзіліся хрысціянскія рэліквіі: кавалачкі Крыжа Гасподняга з кроплямі Ісусавай крыві, драбок каменю ад дамавіны Найсвяцейшай Багародзіцы, часцінкі мошчаў святых Стэфана і Панцелеймана, а таксама кроў святога Дзімітрыя. Найкаштоўнейшымі з іх з'ўляліся часцінкі Святога жыватворнага Дрэва - Крыжа, на якім, ратуючы чалавецтва, сустрэў смерть Хрыстос. Паводле задумы Еўфрасінні, святыня павінна была вечна "жыватварыць" душы палаччанаў і ўсіх жыхароў роднай зямлі.

Трэба падкрэсліць, што ўжо ў старажытнасці нашы продкі глыбока шанавалі крыж як адзін з найгалоўнейшых сімвалаў хрысціянскае веры. У крыжы знаходзілі цудатворную моц, на ім прысягалі, воіны бралі яго з сабою ў паходы. Спецыялісты налічваюць наогул звыш двухсот формаў і відаў крыжа.

Пры гэтым трэба адзначыць, што Крыж паказвае амаль усю гісторыю Новага Запавета і першабытнай Царквы. Ён таксама з'яўляецца і каштоўным помнікам старажытнабеларускага пісьменства. Кароткі дробны надпіс на адваротным баку, каля мошчаў св. Панцялеймана, паведамляе нам імя аўтара гэтага мастацкага шэдэўра і тое, што ён створаны дзеля храма святога Спаса: "Господи, помози рабоу своемоу Лазорю, нареченому Богъши, съделавъшемоу кръсть сии црькви святаго Спаса и Офросиньи". Пачатак надпісу супадае з тым, што быў высечаны на "Барысавых камянях".

На пазлачоных пластках выбіты вялікі тэкст з цікавымі гістарычнымі звесткамі (я яго адразу прачытаю на беларускай мове): "У лета 6669 (паводле сучаснага летазлічэння, 1161) кладзе Еўфрасіння святы крыж у сваім манастыры, у царкве святога Спаса. Дрэва святое бясцэннае, акова ж яго, золата і срэбра, і камяні, і перлы на 100 грыўняў, а да...(пропуск) 40 грыўняў. І хай не выносяць яго з манастыра ніколі, і не прадаюць, не аддаюць. Калі ж не паслухаецца хто і вынесе з манастыра, хай не дапаможа яму святы крыж ні ў жыцці гэтым, ні ў будучым, хай пракляты будзе ён святой жыватворнаю Тройцаю ды святымі айцамі 300 і 50 (?) сямі сабораў святых айцоў і хай напаткае яго доля Юды, які прадаў Хрыста. Хто ж насмеліцца ўчыніць такое... валадар, або князь, або епіскап ці ігуменія, або іншы які чалавек, хай будзе на ім гэты праклён. Еўфрасінняж, раба Хрыстова, што справіла гэты крыж, здабудзе вечнае жыццё з усімі святымі..."

Змешчаны на крыжы заклён, што абяцаў страшную кару таму, хто ўкрадзе або аддасць ці прадасць святыню, безумоўна, дзейнічаў на сучаснікаў Еўфрасінні і на іхніх нашчадкаў. І усё ж страх перад праклёнам не быў неадольным. Лёс Крыжа быў складаны, але я паспрабую апісаць асноўныя "пункты вандроўкі" нашай святыні.

У спасаўскім манастыры Крыж заставаўся толькі да канца XII ст. Потым ён трапіў у Смаленск, потым у Маскву. Цікава, што, каб у час абрадаў асвячэння вады не пашкодзіць каштоўную хрысціянскую святыню, у 1495 годзе была зроблена досыць блізкая копія крыжа, якую выкарыстоўвалі ў падобных выпадках. У 1579 годзе царква Спаса, дзе знаходзіўся Крыж, перайшла да езуітаў. З гэтага часу палачане захоўвалі рэліквію ў Сафійскім саборы, які тады быў уніяцкім храмам. І, добра разумеючы ўплыў рэліквіі на вернікаў-беларусаў, езуіты распачалі судовы працэс, каб вярнуць Крыж у Спасаўскую царкву. Цікава, што галоўным іх аргументам быў старажытны надпіс. Праіграўшы суд, езуіты паспрабавалі атрымаць святыню хітрасцю. Паданне кажа, што аднойчы, калі на свята Узвіжання рэліквію вынеслі на сярэдзіну храма, пасланец езуітаў падмяніў яе, паклаўшы на аналой падрыхтаваную загадзя падробку. Але вернікі-уніяты хутка заўважылі падмену і здагналі выкрадальніка на вуліцы, вярнуўшы святыню ў сабор. 23 траўня (ст. стылю) 1841 года хросны ход урачыста перанёс рэліквію з Сафійскага сабора ў храм Спаса Крыж паклалі ў келлі, дзе найпадобнейшая Еўфрасіння пражыла свае апошнія гады.

Лёс святыні у савецкі час нагадвае дэтэктыў, сутнасць якога тупіковая сітуацыя, якая і парадзіла ідэю ўзнаўлення Крыжа Еўфрасінні Полацкай. Узнікла яна ў 1992 годзе падчас святкавання 1000-годдзя заснавання Полацкай праваслаўнай епархіі і правядзення Першага сходу беларусаў блізкага замежжа. Работа па аднаўленню праваслаўнай святыні была даручана вядомаму берасцейскаму, аднаму з нешматлікіх у Беларусі, мастаку-эмальеру Мікалаю Пятровічу Кузьмічу.

Сказаць, што перад майстрам стаяла архіскладная задача, - значыцца, не сказаць амаль нічога. Дастаткова нагадаць, што сакрэт тэхналогіі перагародкавай эмалі быў страчаны на ўсходнеславянскіх землях восем стагоддзяў таму.

Але, перш чым мастак перайшоў да працы з матэрыялам і наблізіўся да свайго галоўнага адкрыцця, было яшчэ паўтара года пошукаў і кансультацый з гісторыкамі. Выступаючы ў ліпені на пасяджэнні створанай пры ЗБС (Згуртаванне беларусаў свету) "Бацькаўшчына" навукова-грамадскай рады са справаздачай пра першы этап працы, майстар быў не надта шматслоўны: "Скурпулёзна вывучаліся помнікі дэкаратыўнага мастацтва XII стагоддзя. У Сактк-Пецярбургу, у Музеі гістарычных каштоўнасцяў, пазнаёміўся са шклянымі негатывамі здымкаў Крыжа, зробленымі ў 1896 годзе фатографам Чысцяковым. З іх аддрукаваныя першыя ідэнтычныя фота рэліквіі. Т.М. Макаравай было падрыхтавана поўнае апісанне Крыжа, што дало наймагутнейшы імпульс у аднаўленні ягонае іканаграфіі. Л.В. Аляксееў узнавіў творчае аблічча майстра Богшы і яго эпохі..."

Сучаснаму спадкаемцу старажытных ювеліраў даводзілася працаваць літаральна наўслеп, навобмацак, шляхам сотняў спроб і памылак, спадзеючыся не толькі на набытыя веды, але і на інтуіцыю, на Божую дапамогу.

Аднаўляючы надпіс на Крыжы, Мікола Кузьміч вырабіў больш за 300 чаканаў. Кожны – асобная літара. Аднак самае адказнае – 20 мініяцюрных эмалёвых "партрэтаў" – яшчэ чакала наперадзе. Мастак авалодаў тэхнікай "малявання" танюткімі перагародкамі, але тут узнікла новая цяжкасць: як прылітаваць іх да залатой асновы? І майстар упэўнены, што менавіта голас з неба навёў яго ў адзін з самых складаных перыядаў пошукаў на думку запаволіць рэакцыю эмалі адмысловай прысыпкай. Для лёсу адноўленага Крыжа гэтае адкрыццё было ледзве не вырашальным.

Калі Крыж быў амаль гатовы, мастак прапанаваў мітрапаліту Філарэту паўтарыць тыя пласткі, якія лічыў не зусім удалымі. Аднак уладыка даў мудрую параду пакінуць рэліквію без мастацкага "рэдагавання", каб захаваць для гісторыі не толькі вынік, але і рэчыўнае ўвасабленне самога працэса адраджэння святыні.

Пасля заканчэння работ легендарны Крыж быў асвечаны ў Свята-Сімяонаўскім кафедральным саборы Брэста.

І вось 27 верасня 1997 года, на свята Узвіжання, абсалютная копія Крыжа Еўфрасінні Полацкай была дастаўлена ў старажытны горад Полацк. Паколькі ў Спаса-Праабражэнскай царкве на той час не было ўмоў для надзейнай аховы рэліквіі, яе часова змясцілі ў Крыжазвіжальным саборы. А ўжо 6 снежня 1997 года адбылося ўрачыстае ўскладанне Крыжа туды, куды ён быў пакладзены яшчэ ў 1161 годзе – у Спаса-Праабражэнскую царкву.

Крыж святой Еўфрасінні ўвасабляў перамогу над злом, сімвалізаваў адзінства сіл дабра. Разам з тым рэліквія спалучала хрысцянскія каштоўнасці з патрыятычнымі ідэаламі. Яна адначасова была сімвалам і святасці старажытнай Беларусі і яе дзяржаўнасці. Для нашай сучаснай незалежнай Беларусі і для духоўнай свядомасці яе народа ён патрэбен так, як і для старажытнай Полацкай дзяржавы.

## СПІС ЦЫТАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Арлоў, У.К. Еўфрасіння Полацкая. – Мінск: Полымя, 1992. – 168 с.

2. Аляксееў, Л.Н. Крест – хранітель всея вселенныя / Л.Н. Аляксееў, Т.С. Макарава. М.П. Кузьміч – Мінск: Асвета. – 1996. – 102 с.

3. Аляксееў, Л.Н. Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны / Л.Н. Аляксееў, Т.С. Макарава М.П. Кузьміч –Мінск: Асвета. – 1995. – 129 с.